Гэта ўсё, як паказала практыка, дае магчымасць паскорыць авалоданне рэжысёрскай прафесіяй у сучасным яе выглядзе і палепшыць якасць выхавання рэжысёра.

Агафонава Н.А.,
канд. мастацтвазнаўства,
выкладчык

## ТЭАТРАЛІЗАЦЫЯ ТЭЛЕБАЧАННЯ ЯК МАСТАЦТВАЗНАЎЧАЯ ПРАБЛЕМА

Тэлебачанне здольна адлюстроўваць дынаміку рэчаіснасці ў бягучай плыні часу і прасторавым бязмежжы. Аднак тэлебачанне не капіруе літаральна жыццё, а інтэрпрэтуе яго падзеі і факты пры дапамозе экранных сродкаў выразнасці. Прычым універсальная прырода ТБ дазваляе рэалізаваць вобразныя магчымасці ва ўсім спектры тэлепраграмы -- ад публіцыстычных да іграявых формаў. Такім чынам, ТБ перакладае жыццёвую рэчаіснасць на мову відовішча, выкарыстоўваючы для гэтага прыёмы тэатралізацыі.

Асноўнымі прынцыпамі тэатралізацыі з'яўляюцца візуалізацыя і пабудова дыскурсаў. Гэта значыць, што кожны аб'ект, які аказваецца перад тэлекамерай, пачынае іграць на публіку, г.зн. адчувае эфект артызацыі. Адпаведна здзяйсняецца агульная мадэль тэатралізаванага відовішча: «Я -- у прапанаваных абставінах», дзе «Я» можа быць і рэальнай асобай, і выдуманым персанажам. Пры гэтым абавязкова распачынаецца двуадзіная ігра:

-- адкрытая ігра тэлекамеры, якая пры дапамозе ракурсаў, планаў, рытмічнай працягласці надае асобе статус экраннага героя;

-- схаваная ігра асобы ў тэлекадры (гэта ігра можа быць неўсвядомленай, г.зн. схаванай для самога ўдзельніка; яна можа быць ім усвядомлена, але схавана для публікі, напрыклад фарміраванне іміджу з мэтай маскіроўкі сапраўднага твару).

Менавіта асоба ў тэлекадры стварае атмасферу тэлевідовішча, фарміруе архітэктоніку тэлетвора, ўносіць тое (тып, характар, прывабнасць, гумар), што вызначае своеасаблівасць кожнай перадачы.

Тэлевізійнае асяроддзе тэатралізавана наскрозь. Прыкметы гэтага існуюць ужо ў тэлевізійнай праграме, адкуль глядач выбірае цыклы, адпаведныя яго інтарэсам. Назвы рубрык, іх дыктарская аб'ява з'яўляюцца першым узроўнем тэатралізацыі. Далей іграявыя формы і драматызаваныя сітуацыі пранізваюць кожную асобную перадачу -- ад тэлерэкламы да грандыёзных «палітычных спектакляў». Дастаткова прыгадаць канец 80-х гг., калі збіраў аншлагі «палітычны тэатр» тэлебачання -- шматсерыйныя трансляцыі з'ездаў, сесій. Сваім драматычным напалам і разнастайнымі каларытнымі «персанажамі» гэтыя тэлевідовішчы захаплялі вялікую аўдыторыю глядачоў. З 1991 г. зноў узрос прыярытэт мастацкіх форм тэлебачання.

Такім чынам, зменлівая рэчаіснасць (у тварах і дакументах) знаходзіць на тэлеэкране сваё сінхроннае адлюстраванне -- тэатралізаванае жыццё. Ступень тэатралізацыі тэлевідовішча непасрэдна залежыць ад «інтэрвалу тоеснасці» паміж падзеяй і яе тэлевізійнай версіяй.

Марозава Л.І.,
ст. выкладчык

## УПЛЫЎ ЭСТЭТЫЧНАЙ САМААДУКАЦЫІ НА АДАПТАЦЫЮ СТУДЭНТАЎ

З мэтай вызначэння ўзроўню эстэтычнага выхавання студэнтаў, яго ўплыву на адаптацыю да педагагічнага працэсу ВНУ было праведзена даследаванне сярод студэнтаў-першакурснікаў Беларускага універсітэта культуры. Студэнтам было прапанавана адказаць на наступныя пытанні:

1. Якія справы, з Вашага пункту гледжання, ў найбольшай ступені садзейнічаюць згуртаванню Вашага калектыву?

2. Ці займаецеся вы самаадукацыяй у галіне культуры?

3. У якой меры вы пасяваеце сачыць за падзеямі ў культурным жыцці?

4. Як часта Вы, у параўнанні з апошнім годам перад паступленнем ва універсітэт, наведваеце розныя культурныя мерапрыемствы?

5. Як часта Вы
слухаеце радыё,
глядзіце тэлепраграмы,
чытаеце газеты,
чытаеце мастацкую літаратуру?

6. Якую мэту Вы ставіце пры выбары кніг, наведванні тэатраў, выстаў, кінатэатраў?

7. Якую літаратуру Вы чытаеце?

Аналіз анкет дазволіў пацвердзіць гіпатэтычна вылучаны тэзіс аб тым, што ўдзел у праграмах мастацкай самадзейнасці з'яўляецца не толькі фактарам павышэння сацыяльнай актыўнасці, дапамагае падрыхтоўцы будучых сацыяльных педагогаў да творчай працы, але і садзейнічае сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі, таму што павышае магчымасці зносін з аднакурснікамі. 60% апытаных студэнтаў аднеслі мастацкую творчасць да аднаго з самых важных фактараў, якія садзейнічаюць згуртаванню студэнцкага калектыву.

Па ўзроўню эстэтычнай актыўнасці студэнты падзелены на тры групы. Да першай, найменш ініцыятыўнай у плане эстэтычнай самаадукацыі адносяцца 43% ад агульнай колькасці ўдзельнікаў эксперымента; да другой, сярэдняй -- 34% і да трэцяй, самай актыўнай -- толькі 23%.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

У першую групу ўвайшлі студэнты, якія не выяўляюць цікавасці да эстэтычнай дзейнасці, іх эстэтычная актыўнасць носіць выпадковы, сітуацыйны характар. Яны слухаюць радыё, зрэдку глядзяць тэлепраграмы; музеі, тэатры, мастацкія выставы наведваюць некалькі разоў у год, прычым колькасць гэтых наведванняў у іх застаецца на тым узроўні, якой была да паступлення ва універсітэт. Аддаюць перавагу літаратуры дэтэктыўнай ці навукова-фантастычнай. На пытанне: «Якую мэту Вы ставіце пры выбары кніг, наведванні тэатраў, выстаў, кінатэатраў?»-- даюць адказ: «Проста пазабаўляцца, адпачыць».

Другую групу склалі студэнты, якія валодаюць элементарнымі асновамі эстэтычных ведаў, праяўляюць пэўную цікавасць да эстэтычнай самаадукацыі. Яны часцей, чым да паступлення ў ВНУ, наведваюць розныя мерапрыемствы, але не ўцягнутыя ў стабільныя формы сацыяльна-культурнай дзейнасці. Імі кіруе толькі жаданне быць у курсе тых падзей культурнага жыцця, аб якіх больш за ўсё гавораць.

Да трэцяй групы мы аднеслі першакурснікаў з эстэтычнымі інтарэсамі, якія стабільна праяўляюцца ў жыцці. Мэта іх эстэтычнай самаадукацыі -- павышэнне культурнага ўзроўню, неабходнасць яго для пасляховай вучобы.

Асноўным якасным крытэрыем цікавасці да эстэтычнай самаадукацыі з'яўляецца творчая актыўнасць студэнтаў. Задача ВНУ -- мэтанакіраванае педагагічнае кіраўніцтва, пошук новых форм работы па эстэтычнаму выхаванню студэнтаў, фарміраванне ў іх інтарэсу да самаадукацыі ў галіне эстэтыкі, што спрыяе дыдактычнай сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі студэнтаў малодшых курсаў.

Скарына А.А.,
выкладчык

## ВЫКАРЫСТАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У ПРАЦЭСЕ ДАЛУЧЭННЯ ДЗЯЦЕЙ ДА КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Узмацненне грамадскага інтарэсу да гістарычнага вопыту і каштоўнасцей культуры мінулага сведчыць аб глыбокіх сацыяльных зменах, якія адбываюцца ва ўсім свеце ў апошняе дзесяцігоддзе. Сама патрэбнасць у засваенні спадчыны і асабістая выбіральнасць успрымання каштоўнасцей культуры фарміруюцца на аснове індывідуальнага сацыяльнага вопыту і таму знаходзяць сабе тлумачэнне не толькі ў асаблівасцях тэарэтычнага мыслення, але і сацыяльнай псіхалогіі суб'екта. Значыць, псіхалогію суб'екта можна фарміраваць. З аднаго боку, механізм фарміравання асобы першапачаткова закладзены ў прыродзе культурна-гістарычных традыцый. З другога, сацыялізацыі чалавека садзейнічаюць і несвядомыя сувязі, сутыкненні яго з разнастайнымі праяўленнямі культурнай спадчыны, якія нават самі па сабе ўключаюцца ў сферу фарміравання духоўнага патэнцыялу. Але найбольш прадуктыўным сродкам фарміравання духоўнага патэнцыялу з'яўляецца непасрэдная перадача сацыяльнага вопыту ад старэйшых пакаленняў малодшым пры цесным кантакце ў паўсядзённым жыцці. Сучасныя сувязі бацькоў і дзяцей па прычыне занятасці прафесійнай дзейнасцю першых носяць спантанны і бессістэмны характар, асабліва ў сферы мастацкіх інтарэсаў. Сёння сям'я страціла ролю лідэра ў сацыялізацыі падрастаючага пакалення.

Падтрыманню сацыяльнага статуса дзіцяці ў грамадстве, развіццю яго інтарэсаў, адаптацыі да змен у свеце, узмацненню гістарычнай свядомасці, далучэнню да традыцый народнай культуры могуць садзейнічаць цэнтры сацыякультурнага абслугоўвання, напрыклад цэнтры народнай культуры, нацыянальныя культурныя цэнтры. Яны могуць выконваць шмат функцыянальных задачы, з'явіцца базай для дзейнасці рознага роду вучэбных цэнтраў і груп па інтарэсах, ствараць умовы для пасіўнага і актыўнага адпачынку дзяцей і інш. У іх можа ажыццяўляцца вывучэнне нацыянальнай культуры (ад выяўлення і вывучэння гістарычнай спадчыны свайго народа да стварэння ўмоў для распаўсюджвання прыдбаных ведаў у выглядзе кансультацый, семінараў, канцэртаў, свят і фестываляў, арганізацыі калектываў народнай творчасці).

Вялікае выхаваўчае і прапагандысцкае значэнне мела адкрыццё ў розных рэгіёнах краіны фальклорна-этнаграфічных музеяў пад адкрытым небам, дзе магчыма ўзнавіць не толькі архітэктурныя набудовы традыцыйнага ўкладу жыццядзейнасці нашых продкаў, але і іх «культурную атмасферу»: фальклорныя аўтэнтычныя песні, танцы, гульні, абрады. Арганізацыя такіх канцэртных выступленняў дзяцей разам з дарослымі з'явілася б своеасаблівай справаздачай дзяцей аб сваёй пошукавай краязнаўчай дзейнасці, прапагандай нацыянальнай культуры і яркім прыкладам для пераймання. Усё гэта служыла б пасляховаму ўключэнню «класічных» нацыянальных каштоўнасцей у кантэкст сучасных культурных працэсаў.

Пархамовіч Т.А.,
аспірантка

## НЕКАТОРЫЯ ПРАБЛЕМЫ ЭТНАПСІХАЛАГІЧНАГА АНАЛІЗУ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Час сённяшні – гэта час новага адраджэння для беларускага этнасу.

Гістарычны лёс беларусаў быў нялёгкім і супярэчлівым, але ж і паняцце «беларусы» было не заўсёды

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ